Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра гісторыі Беларусі

**Дз.В. Юрчак**

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

***Метадычныя рэкамендацыі***

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2016*

Репозиторий ВГУ

УДК 94(476)
ББК 79.04(4Беи)я73
Ю83

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 2 ад 24.12.2015 г.

Аўтар: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук **Дз.В. Юрчак**

Р э ц э н з е н т ы :
намеснік старшыні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта
*П.М. Падгурскі*;
дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
*М.В. Півавар*

**Юрчак, Дз.В.**

**Ю83** Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі : метадычныя рэкамендацыі / Дз.В. Юрчак. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016. – 48 с.

Метадычныя рэкамендацыі па курсу "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі" будуць карысныя для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 12-04 "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)", а таксама краязнаўцаў, супрацоўнікаў музеяў, спецыялістаў рай- і гарвыканкамаў, якія занятыя ў галіне зберажэння гісторыка-культурных каштоўнасцей.

У рабоце прыведзены змест курса, суаднесены з пытаннямі да заліку, асноўная літаратура, спіс дзеючых нарматыўна-прававых актаў, адрасы спецыялізаваных інтэрнэт-рэсурсаў і заданні да семінараў для студэнтаў гістарычнага факультэта ВДУ.

**УДК 94(476)**
**ББК 79.04(4Беи)я73**

© Юрчак Дз.В., 2016
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2016

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................ 4

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА “АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ” ........................ 5
Дзённая форма навучання ........................................................ 5
Завочная форма навучання ....................................................... 6

ЗМЕСТ КУРСА ..................................................................... 7
Дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны ........ 21
Літаратура ...................................................................... 25
Карысныя інфармацыйныя рэсурсы ................................................. 28

ЗАДАННІ ДА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ................................................. 29
Дзённая форма навучання ........................................................ 29
Модуль 1. Агульнатэарэтычныя пытанні ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны ........ 29
Модуль 2. Агульныя пытанні класіфікацыі, выяўлення, уліку, захавання і зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны ........ 34
Модуль 3. Пытанні вывазу і вяртання гісторыка-культурнай спадчыны. Прыцягненне да адказнасці за парушэнне заканадаўства ў галіне аховы помнікаў ........ 39
Завочная форма навучання ....................................................... 42
Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання ........ 44
Пытанні да заліку ............................................................... 46

Рэпазіторый ВДУ

# УВОДЗІНЫ

Курс "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі" ўваходзіць у сістэму тэарэтыка-метадалагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў музейна-турысцкай галіны. Атрыманыя ў працэсе вывучэння курса веды дапамогуць студэнтам глыбей авалодаць асновамі прафесійнага майстэрства, будуць спрыяць выпрацоўцы навыкаў самастойнай працы, адэкватнай ацэнцы навуковых фактаў і канцэпцый, а таксама спатрэбяцца ў практычнай дзейнасці ў выпадку працы ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Мэта вывучэння дысцыпліны: знаёмства студэнтаў з эвалюцыяй і асаблівасцямі айчыннага заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама рэалізацыяй палажэнняў закону ў практычнай дзейнасці.

Задачы выкладання дысцыпліны:

- пазнаёміць студэнтаў з агульнымі праблемамі захавання культурных каштоўнасцей,
- вызначыць і ахарактарызаваць існуючую дзяржаўную сістэму кіравання і айчыннае заканадаўства ў дадзенай сферы;
- даць веды пра асаблівасці рэалізацыі дзеючага заканадаўства на практыцы і механізмы кантролю за яго выкананнем.

Дадзены курс займае важнае месца пры падрыхтоўцы менеджараў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і турызму, так як садзейнічае фарміраванню прафесійных уменняў па выяўленні аб'ектаў, якія прэтэндуюць на статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, іх навуковай фіксацыі і ўключэнні ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Курс мае практычную скіраванасць, бо дазваляе падрыхтаваць спецыялістаў-практыкаў у галіне прымянення айчыннага ахоўнага заканадаўства ў дачыненні да існуючай гісторыка-культурнай спадчыны.

Праграма курса пабудавана з улікам дзяржаўнага стандарту вышэйшай адукацыі і вучэбнага плана гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Выбар тэм семінарскіх заняткаў ажыццяўляецца на аснове дадзенай праграмы. Асноўнай формай работы студэнтаў з'яўляюцца даклады па найважнейшых праблемах курсу і іх абмеркаванне. Завяршае працу па вывучэнні курсу экзамен (залік), да якога дапускаюцца студэнты, якія праслухалі курс лекцый, паспяхова працавалі на семінарскіх занятках і выканалі неабходны мінімум практычных і творчых заданняў.

Репозиторий ВГУ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА<br>“АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ”

## Дзённая форма навучання

<table>
<tr><th>№</th><th>Назва тэмы</th><th>Лекцыі</th><th>Семінарскія заняткі</th></tr>
<tr><td colspan="4">Модуль 1. Агульнатэарэтычныя пытанні аховы культурных каштоўнасцяў і гісторыка-культурнай спадчыны</td></tr>
<tr><td>1</td><td>Ахова гісторыка-культурнай спадчыны як сацыяльны феномен</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td>2</td><td>Гістарычныя этапы ў вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі і культуры</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td>3</td><td>Развіццё аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td colspan="4">Модуль 2. Класіфікацыя, выяўленне, улік, захаванне і зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны</td></tr>
<tr><td>4</td><td>Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь</td><td>2</td><td rowspan="2">2</td></tr>
<tr><td>5</td><td>Выяўленне гісторыка-культурных каштоўнасцяў</td><td>2</td></tr>
<tr><td>6</td><td>Адбор, улік і зберажэнне гісторыка-культурных каштоўнасцяў</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td>7</td><td>Правядзенне работ на ахоўваемых аб’ектах. Права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td>8</td><td>Ахова і выкарыстанне асобных катэгорый помнікаў</td><td>8</td><td>2</td></tr>
<tr><td colspan="4">Модуль 3. Пытанні вывазу і вяртання культурных каштоўнасцяў. Прыцягненне да адказнасці за парушэнне заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны</td></tr>
<tr><td>9</td><td>Асаблівасці зберажэння і ўтрымання помнікаў на тэрыторыі, пацярпелай ад аварыі на ЧАЭС</td><td>2</td><td>-</td></tr>
<tr><td>10</td><td>Вываз, рэстытуцыя і вяртанне гісторыка-культурнай спадчыны</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td>11</td><td>Адказнасць за парушэнне дзеючага заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны</td><td>4</td><td>2</td></tr>
<tr><td colspan="2">Усяго:</td><td>30</td><td>18</td></tr>
</table>

Репозиторий ВГУ

## Завочная форма навучання

<table>
<tr><th>№</th><th>Назва тэмы</th><th>Лекцыі</th><th>Семінарскія заняткі</th></tr>
<tr><td colspan="4">Модуль 1. Агульнатэарэтычныя пытанні аховы культурных каштоўнасцяў і гісторыка-культурнай спадчыны</td></tr>
<tr><td>1</td><td>Ахова гісторыка-культурнай спадчыны як сацыяльны феномен. Гістарычныя этапы ў вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі і культуры</td><td rowspan="2">2</td><td rowspan="2">2</td></tr>
<tr><td>2</td><td>Развіццё ахова гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь</td></tr>
<tr><td colspan="4">Модуль 2. Класіфікацыя, выяўленне, улік, захаванне і зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны</td></tr>
<tr><td>3</td><td>Выяўленне гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Улік, зберажэнне, ахова і выкарыстанне асобных катэгорый помнікаў</td><td>2</td><td>2</td></tr>
<tr><td colspan="4">Модуль 3. Пытанні вывазу і вяртання культурных каштоўнасцяў. Прыцягненне да адказнасці за парушэнне заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны</td></tr>
<tr><td>4</td><td>Вываз, рэстытуцыя і вяртанне гісторыка-культурнай спадчыны. Адказнасць за парушэнне дзеючага заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны</td><td>2</td><td>-</td></tr>
<tr><td colspan="2">Усяго:</td><td>6</td><td>4</td></tr>
</table>

Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ КУРСА

(Складзены на аснове дзеючай вучэбнай праграмы курса і прыведзены ў форме кароткага зместу адказаў на пытанні да заліку)

**1. *Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як вучэбная дысцыпліна і практычная дзейнасць: асаблівасці, змест, сувязь з іншымі курсамі і навукамі.***

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як вучэбная дысцыпліна. Кароткі змест вучэбнага курса. Мэты і задачы курса. Сувязь з іншымі навукамі і вучэбнымі дысцыплінамі: правазнаўствам, гісторыяй, дапаможнымі гістарычнымі дысцыплінамі, археалогіяй, этнаграфіяй, архітэктурай і г.д. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны як практычная дзейнасць і частка дзяржаўнай культурнай палітыкі.

**2. *Помнік, каштоўнасць, спадчына, набытак: інтэрпрэтацыі паняццяў у навуковай літаратуры і заканадаўстве. Культурныя каштоўнасці.***

Агульныя паняцці “помнік”, “каштоўнасць”, “спадчына”, “набытак” ў беларускім і сусветным заканадаўстве. Адрозненні паняццяў. Змест паняцця “спадчына”. Культурная, прыродная і змешаная спадчына. Класічны і пастмадэрнісцкі падыход да паняцця “спадчына”. Культурныя каштоўнасці і гісторыка-культурныя каштоўнасці: асаблівасці паняццяў.

**3. *З’яўленне і эвалюцыя культу спадчыны. Станаўленне грамадства да помнікаў у розныя эпохі.***

Праблема ўзнікнення культу спадчыны. Асноўныя тэорыі: Эвалюцыянізм. Дыфузіянізм. Функцыяналізм. Канструктывізм. Структурны накірунак. Адносіны да помнікаў гісторыі і культуры ў старажытнасці (культ продкаў, рэліквіі), сярэднія вякі, новы і навейшы час. Змяненне стаўлення да гісторыка-культурнай спадчыны ў сусветнай практыцы. Першыя ахоўныя мерапрыемствы, стварэнне адмысловага заканадаўства і ўстаноў. Спадчына ў перыяд фарміравання нацыянальных дзяржаў. Сучасны культ спадчыны.

**4. *Месцы памяці і гістарычная свядомасць. Гістарычная палітыка і гісторыка-культурная спадчына.***

Паняцці “месца памяці” і “гістарычная свядомасць”. П’ер Нара. Функцыі месцаў памяці. Помнік і яго сучасная інтэрпрэтацыя. Роля грамадства і дзяржавы ў фарміраванні “месцаў памяці”. Гістарычная свядомасць як частка грамадскай свядомасці. Вобразы “свайго” і “чужога” ў гістарычнай свядомасці. Захаванне “гістарычнай памяці” для нашчадкаў. Гістарычная палітыка. Роля дзяржавы ў фарміраванні гістарычнай свядомасці. Гісторыя і культурныя каштоўнасці.

Репозиторий ВГУ

**5. *Культурныя каштоўнасці ва ўмовах глабалізацыі. Спадчына і ідэнтычнасць.***

Змены ў адносінах да спадчыны ў сучасным свеце. Культурная глабалізацыя. Мультыкультурны характар спадчыны. Турысцкая глабалізацыя. Спадчына як тавар. Асноўныя групы "спажыўцоў" спадчыны. Нацыянальная ідэнтычнасць і гістарычная памяць. Працэс "канструявання" нацый і ўзнікненне культу спадчыны. Грамадзянская ідэнтычнасць і змены ў адносінах да гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Роля гісторыка-культурнай спадчыны ў гісторыі і культуры народаў свету. "Культурная спадчына" сацыяльных груп і субкультур.

**6. *Праблема вандалізму. Прычыны знікнення гісторыка-культурнай спадчыны і культурных каштоўнасцяў у свеце.***

Вандалізм як сацыяльная з'ява. Прычыны вандалізму і спосабы барацьбы з ім. Самыя вядомыя прыклады вандалізму ў свеце. Прычыны знікнення гісторыка-культурнай спадчыны. Уздзеянне прыродных фактараў і іх мінімізацыя. Прыродныя катаклізмы. "Ідэалагічны вандалізм". Эканамічныя прычыны. Знішчэнне культурнай спадчыны пад час ваенных канфліктаў.

**7. *Асноўныя прычыны і этапы знікнення і знішчэння культурных каштоўнасцяў на беларускіх землях.***

Ваенныя канфлікты. Заняпад дзяржаўных утварэнняў, існуючых раней на тэрыторыі Беларусі. "Агульнасць гісторыі" і "агульная" спадчына з суседзямі. Неразуменне ролі спадчыны для нацыянальнай культуры. Праблемы з захаваннем спадчыны папярэднікаў ў часы існавання на тэрыторыі Беларусі старажытнарускіх княстваў, ВКЛ, Рэчы Паспалітай. Беларусь ў складзе Расійскай Імперыі і Савецкага Саюза і праблема захавання культурных каштоўнасцяў. Наступствы Першай і Другой сусветных войнаў для культурнай спадчыны.

**8. *Ахова культурных каштоўнасцяў на беларускіх землях у дасавецкі перыяд.***

Ахова помнікаў гісторыі і культуры і іх вывучэнне на Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Цыркуляр "О доставлении сведений об остатках древних зданий и воспрещении разрушать оные" 1826 г. і іншыя спробы ўліку помнікаў. Дзейнасць Імператарскай археалагічнай камісіі. Першыя кансервацыйныя і рэстаўрацыйныя работы. П.П. Пакрышкін. Пачатак археалагічнага вывучэння тэрыторыі Беларусі. Роля грамадскасці і дзяржаўных устаноў. Спроба стварэння ахоўнага заканадаўства ў Расійскай Імперыі. Дзейнасць грамадскіх арганізацый і асобных даследчыкаў па вывучэнні, сістэматызацыі і ахове помнікаў гісторыі і культуры.

Репозиторий ВГУ

**9.** ***Ахова культурных каштоўнасцяў у БССР і СССР.***

Асаблівасці стаўлення новых уладаў да дасавецкай спадчыны. Фарміраванне савецкага заканадаўства аб ахове помнікаў. Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры ў БССР. Інстытут беларускай культуры. Акадэмія навук. Ахова і вывучэнне культурнай спадчыны ў Заходняй Беларусі. Развіццё аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў пасляваенны час: папулярызацыя помнікаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Дзейнасць Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Закон "Аб ахове помнікаў культуры" 1969 г. Закон "Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры" 1978 г. Увядзенне адказнасці за парушэнне заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры.

**10.** ***Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.***

Канстытуцыйнае замацаванне абавязку аховы спадчыны. Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь", 1992 і 2006 гг. Іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія датычацца пытання зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны. Віды НПА: кодэксы, законы, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта, пастановы Савета Міністраў, пастановы Міністэртва культуры, загады Міністра культуры. Рашэнні і распараджэнні мясцовых органаў улады. Праект Кодэкса аб культуры.

**11.** ***Міжнародныя акты ў галіне аховы культурных каштоўнасцяў і іх месца ў нацыянальным праве. Міжнародныя арганізацыі, задзейнічаныя ў зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны.***

Фарміраванне міжнароднага заканадаўства ў галіне аховы спадчыны. Пакт Рэрыха. Гаагская Канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцяў у выпадку ўзброенага канфлікту 1954 г. Еўрапейская культурная канвенцыя 1954 г. Міжнародная хартыя захавання і рэстаўрацыі помнікаў і мясцінаў "Венецыянская хартыя" (1964 г.). Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны 1972 г. Хартыя захавання гістарычных гарадоў і гарадскіх абшараў "Вашынгтонская хартыя" (Вашынгтон, 1987 года). Канвенцыя аб ахове падводнай культурнай спадчыны 2001 г. Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 г. ЮНЭСКА. Міжнародная рада па захаванні помнікаў і памятных мясцін. Europa Nostra. Сусветны фонд помнікаў. Міжнародны савет музеяў.

Репозиторий ВГУ

**12.** ***Дзяржаўныя палітыка і дзяржаўнае рэгуляванне ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі.***

Арганізацыя дзяржаўнай службы аховы помнікаў гісторыі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь. Прынцыпы і асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Кампетэнцыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў, Міністэрства культуры і мясцовых уладаў па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Адказныя за ахову гісторыка-культурнай спадчыны на месцах. Удзел органаў пракуратуры у пытаннях захавання культурных каштоўнасцяў. Паўнамоцтвы органаў архітэктуры, рэстаўрацыі і Дзяржбуднадзора.

**13.** ***Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь: склад і кампетэнцыя.***

Прававыя асновы дзейнасці Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры. Палажэнне аб Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Склад рады. Кампетэнцыя і функцыі рады. Пытанне дзейнасці абласных рад у адпаведнасці з праектам Кодэксу аб культуры.

**14.** ***Грамадскія аб’яднанні і іх роля ў ахове гісторыка-культурнай спадчыны.***

Роля грамадскіх арганізацый і аб’яднанняў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Юрыдычнае замацаванне функцый грамадскіх аб’яднанняў у пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Палажэнне аб парадку ажыццяўлення грамадскімі аб'яднаннямі грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Грамадская назіральная камісія пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны: склад і паўнамоцтвы. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры: гісторыя стварэння, структура і накірункі дзейнасці. Беларускі фонд культуры, іншыя арганізацыі і грамадскія ініцыятывы.

**15.** ***Віды і катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў.***

Віды і падвіды каштоўнасцяў: матэрыяльныя і нематэрыяльныя; нерухомыя і рухомыя. Комплексныя матэрыяльныя і нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Дакументальныя помнікі, запаветныя мясціны, помнікі археалогіі, помнікі архітэктуры, помнікі



Репозиторий ВГУ

гісторыі, помнікі горадабудаўніцтва, помнікі мастацтва. Катэгорыі матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Каштоўнасці без катэгорыі.

**16.** ***Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЭСКА. Помнікі сусветнага значэння ў Беларусі.***

Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972 г.). Міжурадавы камітэт па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. Асаблівасці статусу “аб’екта сусветнай спадчыны”. Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны: структура, асноўныя дзяржавы, прадстаўленыя ў спісе. Крытэрыі адбору. Асаблівасці ўключэння. Помнікі сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны у Беларусі. Аб’екты ў Рэспубліцы Беларусь, якія прэтэндуюць на права ўключэння ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

**17.** ***Прафесійнае выяўленне матэрыяльных і нематэрыяльных каштоўнасцяў. Асаблівасці правядзення археалагічных раскопак. "Чорныя археолагі": рэаліі і прававая ацэнка дзейнасці.***

Асаблівасці прафесійнага выяўлення асобных відаў помнікаў. Выяўленне архітэктурных і этнаграфічных помнікаў. Выяўленне археалагічных помнікаў. Археалагічныя разведкі. Працэдура атрымання дазволу на археалагічныя работы. Адкрыты ліст. Паведамленне пра выяўлены аб’ект. “Чорныя археолагі” і наступствы іх дзейнасці. Гісторыя і сучасны стан з’явы. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 485 ад 14 снежня 2015 г. “Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў” і яго рэалізацыя на практыцы. Археалагічныя аб’екты і артэфакты. Увядзенне ў навуковы зварот археалагічных артэфактаў. Рэестр археалагічных артэфактаў.

**18.** ***Выпадковае выяўленне культурных каштоўнасцяў: юрыдычныя наступствы. Скарбы і скарбашукальніцтва.***

Выпадковае выяўленне аб’ектаў, якія могуць быць прызнаны гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі: асаблівасці і юрыдычныя наступствы. Скарбы. Навуковая ацэнка скрабу. Узнагарода за выяўленне скарбу. Скарбашукальніцтва: замежны і беларускі досвед. Віды скарбаў. Скарбы як гісторыка-культурныя каштоўнасці. Самыя вядомыя скарбы Беларусі і свету.

**19.** ***Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.***

Крытэрыі адбору матэрыяльных аб’ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека для надання ім статусу гісторыка-

Репозиторий ВГУ

культурнай каштоўнасці. Палажэнне аб парадку вядзення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (глава 3 "Парадак унясення прапаноў пра наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці"). Інструкцыя аб парадку фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі выяўленых матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць. Разгляд прапаноў аб наданні матэрыяльным аб'ектам і нематэрыяльным праяўленням творчасці чалавека статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. Пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь: прычыны, працэдура. Асаблівасці пазбаўлення статусу помнікаў археалогіі.

**20.** ***Улік гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: сутнасць і структура.***

Асаблівасці ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей ў Рэспубліцы Беларусь. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Палажэнне аб парадку вядзення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Парадак уключэння аб'ектаў у Дзяржаўны спіс. Структура Дзяржаўнага спіса. Перагляд Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і яго публікацыя. Існуючыя праблемы з улікам помнікаў археалогіі, аб'ектаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, і руінаваных помнікаў архітэктуры ў асобных рэгіёнах. Паўнамоцтвы мясцовых уладаў (згодна з праектам Кодэкса аб культуры).

**21.** ***Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне ў Рэспубліцы Беларусь.***

Пашпарт гісторыка-культурнай каштоўнасці і асаблівасці яго запаўнення. Складальнікі пашпарту. Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 8 снежня 2006 г. № 40 "Аб устанаўленні некаторых форм". Інструкцыя аб парадку запаўнення пашпарта гісторыка-культурнай каштоўнасці. Уліковыя карткі гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх адмена. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб парадку фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь і парадку азнаямлення з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў ім

Рэпазіторый ВДУ

**22.** ***Захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўныя дошкі. Ахова асяроддзя нерухомых матэрыяльных каштоўнасцей і іх зоны аховы.***

Меры па захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей. Забеспячэнне захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Перамяшчэнне нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Ахоўная дошка. Форма ахоўнай дошкі і асаблівасці яе размяшчэння на будынку. Існуючыя праблемы з размяшчэннем ахоўнай дошкі на помніках археалогіі, гісторыі, мастацтва. Зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная зона. Зона рэгулявання забудовы. Зона аховы ландшафту. Зона аховы культурнага пласта. Прадухіленне пагрозы захавання матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Асаблівасці захавання рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Разукамплектаванне комплексных рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Камплект і калекцыя. Асаблівасці захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**23.** ***Утрыманне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей.***

Асаблівасці выкарыстання матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўныя абавязацельствы. Неадпаведнае выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Кампенсацыя за шкоду, што прычыняецца нерухомым матэрыяльным гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам іх аховы. Прадпрымальніцкая дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць або зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Парадак выплаты кампенсацыі за шкоду, што прычыняецца гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**24.** ***Уласнасць на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Абмежаванне правоў уласніка.***

Прававое рэгуляванне пытанняў уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Суб'екты права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Правы ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка калекцыі. Абмежаванне правоў уласніка (уладальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, уладальніка зямельнага ўчастка, на якім размешчаны помнік археалогіі. Абавязкі ўласніка (уладальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, уладальніка зямельнага ўчастка, на якім размешчаны помнік археалогіі. Правы фізічных асоб, якія



Репозиторий ВГУ

маюць непасрэдныя адносіны да ўзнікнення (стварэння) гісторыка-культурнай каштоўнасці. Пераважнае права набыцця гісторыка-культурнай каштоўнасці (яе састаўной часткі). Фінансаванне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

**25.** ***Аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Асаблівасці правядзення навукова-даследчых, праектных, аднаўленчых, рэстаўрацыйных і іншых відаў работ на помніках гісторыі і культуры.***

Віды работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Навукова-даследчыя, праектныя і рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. Археалагічныя, архіўна-бібліяграфічныя і натуральныя даследаванні. Аднаўленчыя работы, дапаўненне, кансервацыя, прыстасаванне, рамонт, раскрыццё, рэгенерацыя, рэканструкцыя, рэстаўрацыя. Выкананне работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях і ў зонах іх аховы. Работы па забеспячэнню належнага тэхнічнага і санітарнага стану матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Асобы, якія дапускаюцца да кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі. Навуковы кіраўнік. Узгадненне навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях і (або) ў зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**26.** ***Рэстаўрацыйныя тэорыі. Прынцыпы рэстаўрацыі. Віды рэстаўрацыйных работ.***

Гісторыя з’яўлення рэстаўрацыі і асаблівасці яе развіцця на сучасным этапе. Стылістычная (“гіпатэтычная”) і археалагічная (тэхнічная) рэстаўрацыя. Навуковая рэстаўрацыя. П.Бараноўскі. Асаблівасці рэстаўрацыі рухомых і нерухомых культурных каштоўнасцяў. Кансервацыя і рэстаўрацыя. Аднаўленчыя работы, дапаўненне, кансервацыя, прыстасаванне, рамонт, раскрыццё, рэгенерацыя, рэканструкцыя, рэстаўрацыя. Асноўныя прынцыпы рэстаўрацыі: мінімальнага ўмяшання ў гістарычны матэрыял з яго максімальным захаваннем; абгрунтаванасць любога рэстаўрацыйнага ўмяшальніцтва, навуковасць, гістарызм. Прыстасаванне помнікаў. Міжнародная хартыя захавання і рэстаўрацыі помнікаў і мясцінаў “Венецыянская хартыя” (1964 г.).

**27.** ***Кансервацыя ці аднаўленне: адрозненні паняццяў і праблема выбару. Руіны як асобны від архітэктурных помнікаў***.

Адрозненне кансервацыі ад аднаўлення. Праблема выбару: еўрапейскі, савецкі і беларускі досвед. Спрэчкі вакол гістарычнасці адноўленых аб’ектаў. Руіны як асобны від архітэктурных помнікаў.

Рэпазіторый ВДУ

Адносіны да руінаў ў розныя эпохі. Руіны як з'ява рэчаіснасці. Віды руінаў. Гістарычныя руіны. Тыпалогія руінаў па часе ўзнікнення і функцыянальным выкарыстанні ў мінулым. Асаблівасці вызначэння руінаваных понікаў у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Праблемы захавання руінаваных аб'ектаў у Беларусі. Перспектывы пашырэння Дзяржаўнага спіса за кошт руінаваных помнікаў. Гістарычныя руіны, не уключаныя ў Дзяржаўны спіс: сучасны стан і перспектывы захавання.

**28.** ***Помнікі археалогіі: віды і асаблівасці захавання.***

Адметныя рысы помнікаў археалогіі ў параўнанні з іншымі культурнымі каштоўнасцямі. Віды помнікаў археалогіі. Асаблівасці захавання: лакалізацыя аб'ектаў, усталяванне ахоўнай дошкі, праблема вызначэння ўласніка. Неадназначнасць падыходаў у розных раёнах рэспублікі да помнікаў археалогіі ў час фарміравання Дзяржаўнага спісу. Ахова археалагічных аб'ектаў пад час земляных і будаўнічых работ. Археалагічнае назіранне спецыялістаў-археолагаў. Меры па захаванню археалагічных аб'ектаў. Падводная археалогія як новы кірунак гістарычнай навукі. Барацьба з "чорнымі капацелямі". Удасканаленне заканадаўства па ахове археалагічнай спадчыны.

**29.** ***Зберажэнне і выкарыстанне помнікаў грамадзянскага і народнага дойлідства. Індустрыяльная спадчына.***

Помнікі грамадзянскага дойлідства ў Беларусі. Захаванне і прыстасаванне помнікаў грамадзянскага дойлідства, іх аднаўленне і адаптацыя. Навучальна-адукацыйныя і тэатральна-відовішчныя збудаванні, паштовыя станцыі і вакзалы, гандлёвыя рады, корчмы, рэстараны, гасцініцы, жылыя будынкі як асобная катэгорыя аб'ектаў грамадзянскага дойлідства, асаблівасці іх захавання. Ахова і прыстасаванне помнікаў народнага дойлідства. Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам. Актуальнасць выяўлення помнікаў драўлянага дойлідства. Аптымальныя формы захавання і прыстасавання да сучасных умоў помнікаў народнага дойлідства. Асаблівасці захавання і выкарыстання помнікаў індустрыяльнай спадчыны.

**30.** ***Праблема захавання гістарычных цэнтраў гарадоў.***

Гістарычныя цэнтры гарадоў, гарадскія гістарычныя прадмесці. Гістарычныя ансамблі і сучасная забудова горада. Ахова і выкарыстанне помнікаў горадабудаўніцтва. Захаванне малых гарадоў. Малыя гарады як захавальнікі гістарычнай і культурнай спадчыны. Мястэчкі Беларусі, спецыфічнай асаблівасці іх планіроўкі. Праблема



Репозиторий ВГУ

стварэння новых архітэктурных аб’ектаў на месцы разбураных знакавых для горада будынкаў. Рэгенерацыя гістарычных цэнтраў. Захаванне культурных ландшафтаў. Закон Рэспублікі Беларусь“Об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности в Республике Беларусь”. Генеральныя планы гарадоў. Горадабудаўнічыя праекты дэталёвага планавання (Дэталёвы план гістарычнага цэнтра г. Віцебска). БелНІІПгорадабудаўніцтва.

**31.** ***Захаванне і выкарыстанне помнікаў культавага дойлідства*.**

Вызначэнне паняцця “культавая архітэктура”. Віды культавых аб’ектаў. Канфесійная сітуацыя на беларускіх землях у гістарычнай рэтраспектыве і яе уплыў на культавае будаўніцтва. Антырэлігійныя кампаніі ў СССР і іх уплыў на захаванне культавых аб’ектаў. Знішчэнне храмаў Віцебска і вобласці. Рэлігійныя арганізацыі, мясцовыя органы ўлады і грамадства ў працэсе аднаўлення страчаных храмаў. Адноўленыя храмы як помнікі архітэктуры. Прыстасаванне помнікаў грамадзянскага дойлідства пад культывыя аб’екты. Праблема вяртання храмаў рэлігійным абшчынам. Існуючыя праблемы з захаваннем культавых аб’ектаў.

**32.** ***Камяні-валуны, мемарыяльныя помнікі і гістарыка-мемарыяльныя месцы пахаванняў: іх захаванне і выкарыстанне.***

Камяні як помнікі прыроды і гісторыі. Самыя вялікія валуны Беларусі і адносіны да іх мясцовых жыхароў. Камяні-следавікі. Рэшткі былых язычніцкіх культавых аб’ектаў. “Музей валуноў” ў Мінску і яго экспанаты. Каменныя крыжы. Старажытныя могілкі як помнікі гісторыі: сусветны і беларускі досвед. Захаванне могілак і старажытных пахаванняў. Гісторыка-мемарыяльныя месцы пахаванняў і іх юрыдычны статус.

**33.** ***Нематэрыяльная гісторыка-культурныя каштоўнасці.***

Асаблівасці і віды нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Крытэрыі адбору нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Катэгорыі нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Спецыфіка ўключэння ў спіс. Асаблівасці захавання. Дзеючыя аб’екты ў Дзяржаўным спісе. Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА (2003 г.). Беларускія аб’екта са Спісу ЮНЭСКА.

**34.** ***Помнікі гісторыі і іх захаванне. Мемарыяльныя дошкі.***

Характэрныя рысы помнікаў гісторыі. Аб’екты, аднесеныя да помнікаў гісторыі ў Дзяржаўным спісе. Асаблівасці вызначэння

Репозиторий ВГУ

помнікаў гісторыі ў савецкім заканадаўстве. Спосабы вылучэння і выкарыстання знакавых гістарычных аб'ектаў. Мемарыяльныя кватэры. Музеі, прысвечаныя знакавым гістарычным падзеям і асобам. Мемарыяльныя ансамблі. Мемарыяльныя і інфармацыйныя дошкі. Асаблівасці стварэння мемарыяльных дошак. Абласныя (і Мінскі гарадскі) мастацка-экспертныя саветы па манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве.

**35.** ***Манументальныя помнікі вядомым гістарычным асобам і падзеям як месцы памяці. Асаблівасці стварэння твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.***

Манументальныя помнікі як форма увекавечання памяці пра гістарычныя падзеі і вядомых асоб. Гісторыя развіцця манументальнага мастацтва ў Беларусі. Манументальныя помнікі – гісторыка-культурныя каштоўнасці. "Вайна" з помнікамі. Манументальная і манументальна-дэкаратыўная скульптура: віды і асаблівасці. Асаблівасці стварэння мемарыяльных ансамбляў, манументаў-помнікаў, помнікаў, а таксама помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў, якія ствараюцца ў абласных цэнтрах і г. Мінску. Асаблівасці стварэння помнікаў-бюстаў і надмагільных помнікаў, якія ствараюцца на тэрыторыях абласцей, за выключэннем абласных цэнтраў. Рэспубліканскі мастацка-экспертны савет па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву. Праектаванне твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, парадак адбору праектаў. Парадак зацвярджэння эскізных праектаў і іх стварэння. Фінансаванне стварэння помнікаў. Дзяржаўная прыёмка твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

**36.** ***Ваенная спадчына у Беларусі: месцы памяці і праблемы захавання. Увекавечанне памяці пра Вялікую Айчынную вайну.***

Вялікая Айчынная вайна і іншыя ваенныя канфлікты ў гістарычнай памяці беларускага народа. Аб'екты ваеннай спадчыны ў Дзяржаўным спісе. Пытанне пра статус ваенных пахаванняў як гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Пастанова Савета Міністраў "Об увековечении памяти защитников Отечества и жертв войн". Указ Прэзідэнта "Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн". Асноўныя формы увекавечання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. Тыпы воінскіх пахаванняў. Парадак дзяржаўнага уліку воінскіх пахаванняў (пашпартызацыя). Арганізацыя пашуковай дзейнасці ў рэспубліцы. Асаблівасці перапахавання: прававыя асновы і працэдура. Пахаванні салдат краін-агрэсараў на Беларусі.

Репозиторий ВГУ

**37.** ***Захаванне і выкарыстанне помнікаў прыроды.***

Асабліва ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі Рэспублікі Беларусь: запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі (рэспубліканскага і мясцовага значэння), помнікі прыроды. Рэестр асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Рэжым аховы, ахоўныя зоны. Віды помнікаў прыроды: батанічныя, гідралагічныя, геалагічныя. Актуальнасць праблемы захавання паркаў і асноўныя элементаў гістарычнага паркавага ландшафту. Класіфікацыя паркаў па ступені іх захаванасці і па стылёвых асаблівасцях. Меры па захаванні паркавых кампазіцый і збудаванняў. Паркі як гісторыка-культурныя каштоўнасці.

**38.** ***Прадметы музейнага і бібліятэчнага фонду, архіўныя фонды і архіўныя дакументы як культурныя каштоўнасці.***

Агульнае паняцце гістарычнага артэфакта. Музейныя прадметы і іх юрыдычны статус. Прадмет музейнага значэння. Музейны прадмет, навукова-дапаможны і сыравінны матэрыял. Музейны фонд Рэспублікі Беларусь. Музейныя прадметы як аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны. Архіўныя фонды і іх юрыдычны статус. Дакументальныя помнікі. Бібліятэчны фонд. Кніжныя помнікі. Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь.

**39.** ***Асаблівасці зберажэння і утрымання культурных каштоўнасцяў у раёнах, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС.***

Функцыі і задачы Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Дзяржаўная праграма па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльская АЭС. “Звод помнікаў археалогіі чарнобыльскай зоны”. Збор і апрацоўка звестак аб наяўнасці помнікаў гісторыі, архітэктуры і культуры ў населеных пунктах, якія падлягалі адсяленню. Кансервацыя помнікаў і дэзактывацыя твораў мастацтва, каштоўных кніг, абразоў. Распрацоўка спосабаў іх захавання. Спыненне дзейнасці Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Дзейнасць экспедыцый ІМЭФ імя К. Крапівы НАНБ.

**40.** ***Асаблівасці вывазу культурных каштоўнасцяў і прыроўненых да іх аб’ектаў за мяжы Беларусі.***

Юрыдычныя падставы і асаблівасці вывазу за мяжу арыгіналаў дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду. Асаблівасці вывазу за мяжу культурных каштоўнасцяў. Заключэнне міністэрства культуры: працэдуры афармлення для вывазу культурных і гісторыка-

Рэпазіторый ВДУ

культурных каштоўнасцяў. Выпадкі, калі вываз за межы рэспублікі культурных каштоўнасцяў дазваляецца ці забаронены. Супрацьстаянне “культурнай кантрабандзе”. Чорны рынак гістарычных і культурных каштоўнасцяў.

**41.** ***Праблема вяртання і рэстытуцыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Дзейнасць дзяржаўных органаў і грамадскіх аб’яднанняў па пытаннях вяртання: праблемы і дасягненні.***

Культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь. Агульныя пытанні рэстытуцыі і вяртання незаконна вывезеных каштоўнасцяў. Беларуская спадчына за мяжой: асноўныя асяродкі і помнікі нацыянальнай спадчыны. Дзейнасць дзяржаўных органаў і грамадскіх аб’яднанняў па пытаннях вяртання: праблемы і дасягненні. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Камісія «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры. Вынікі пошукаў і вяртання каштоўнасцяў дзякуючы дзейнасці спецыялістаў і энтузіястаў.

**42.** ***Віды адказнасці за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей. Крымінальная адказнасць.***

Агульныя пытанні адказнасці за парушэнне заканадаўства. Дысцыплінарная, матэрыяльная, адміністрацыйная і крымінальная адказнасць: змест і адрозненне. Структура складу правапарушэння і злачынства. Незаконнае карыстанне знакамі, ахоўваемымі міжнароднымі дамовамі. Невяртанне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці. Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцяў або матэрыяльных аб'ектаў, якім можа быць прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Прысваенне археалагічных артэфактаў. Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцяў або матэрыяльных аб'ектаў, якім можа быць прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, па неасцярожнасці. Здзек над гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі. Здзек над трупам або магілай. Працэсуальныя асаблівасці прыцягнення да крымінальнай адказнасці.

**43.** ***Адміністрацыйная адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей*.**

Невыкананне патрабаванняў заканадаўства аб абыходжанні з матэрыяльнымі аб'ектамі і нематэрыяльнымі праявамі творчасці чалавека, якім можа быць прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Невыкананне патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў



Репозиторий ВГУ

у дачыненні да гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Парушэнне парадку і (або) умоў выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях альбо здзяйсненне дзеянняў, якія ствараюць пагрозу гісторыка-культурным каштоўнасцям. Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцяў або матэрыяльных аб'ектаў, якім можа быць прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Парушэнне рэжымаў утрымання і (або) выкарыстання зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Невыкананне патрабаванняў аб абмежаванні правоў уласніка гісторыка-культурнай каштоўнасці. Парушэнне парадку ўскрыцця вайсковых пахаванняў альбо правядзення пошукавых работ. Незаконны пошук і абаротархеалагічных аб’ектаў і артэфактаў.

**44.** ***Працэсуальныя асаблівасці складання пратаколаў аб адміністрацыйнай адказнасці.***

Падведамнаснасць спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Правы і абавязкі асобы, у адносінах да якой вядзецца адміністрацыйны працэс: асаблівасці азнаямлення з правамі. Падставы для пачатку адміністрацыйнага працэсу. Абставіны, якія выключаюць адміністрацыйны працэс. Тэрміны падрыхтоўкі справы аб адміністрацыйным правапарушэнні да разгляду. Пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні: асаблівасці складання, абавязковыя элементы. Парадак выкліку удзельнікаў адміністрацыйнага працэсу і апытання асоб, якія ўдзельнічаюць у адміністрацыйным працэсе. Заканчэнне падрыхтоўкі справы аб адміністрацыйным правапарушэнні да разгляду. Азнаямленне законнага прадстаўніка асобы, у адносінах да якой вядзецца адміністрацыйны працэс, з матэрыяламі справы аб адміністрацыйным правапарушэнні. Напрамак справы аб адміністрацыйным правапарушэнні.

Рэпазіторый ВДУ

## Дзеючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны

### Асноўныя НПА, якія рэгулююць праваадносіны ў вызначанай сферы па стане на пачатак 2016 года:

### Законы Рэспублікі Беларусь:

1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З.

2. Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 04.06.1991 № 832-XII

3. О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь и признании утратившим силу Постановления Президиума Верховного Совета Республики Беларусь «О реорганизации дела охраны историко-культурного наследия в Республике Беларусь»: Закон Республики Беларусь от 7 мая 2007 г. № 212-З.

### Дзяржаўны Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў

1. Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.05.2007 № 578.

### Выяўленне аб’ектаў ГКС

1. Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі выяўленых матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць: Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад от 31.05.2007 № 26.

### Вядзенне дакументацыі і рэалізацыя нормаў па ахове ГКС

1. Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15.06.2006 № 762 (зацверджаны 1) Палажэнне аб парадку вядзення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь; 2) Палажэнне аб парадку фарміравання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь і парадку азнаямлення з інфармацыяй, якая змяшчаецца ў ім; 3) Палажэнне аб парадку выдачы дазволу на выкананне работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях і (або) у зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; 4) Палажэнне аб парадку выдачы пасведчанняў на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рэстаўрацыйна-аднаўленчых



Репозиторий ВГУ

работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях і (або) у зонах аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; 5) Палажэнне аб Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры).

2. Аб устанаўленні некаторых форм: Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 08.12.2006 № 40 (пашпарт, ахоўная дошка, ахоўнае абавязацельства).

3. Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку запаўнення пашпарта гісторыка-культурнай каштоўнасці і прызнанні страціўшымі сілу пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 29 жніўня 2007 г. № 37 і структурнага элемента пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 11 снежня 2008 г. № 45: Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 02.05.2013 № 27.

4. Аб зацверджанні Інструкцыі аб парадку ажыццяўлення агляду нерухомых аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28.12.2012 № 91.

5. Инструкция о порядке заполнения формы ведомственной отчетности «Сведения о ходе реализации положений Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»: Утверждена Приказом Министерства культуры Республики Беларусь от 28.11.2008 № 319.

**Сістэма падаткаабкладання і ацэнка каштоўнасцяў**

1. О порядке оценки стоимости культурных ценностей: Указ Президента Республики Беларусь от 19.04.2007 № 190.

2. Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18.10.2007 № 527 (Палажэнне аб парадку ажыццяўлення адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць або зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, выплаты кампенсацый за шкоду, што прычыняецца гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей).

3. Аб зацвярджэнні Палажэння аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2007 г. № 527: Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 14.12.2007 № 50.

4. Об утверждении Инструкции по оценке стоимости памятников архитектуры, истории, градостроительства в составе недвижимых материальных историко-культурных ценностей: Приказ Министерства культуры Республики Беларусь от 30.08.2007 № 196.

Репозиторий ВГУ

5. О некоторых вопросах налогообложения в сферах культуры и информации: Указ Президента Республики Беларусь от 14.04.2011 № 145.

6. Аб зацвярджэнні пералікаў матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, якія вызваляюцца ад падатку на нерухомасць, і землі, занятыя якімі, вызваляюцца ад зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.12.2012 № 1194.

**Удзел грамадства ў ахове ГКС**

1. Об утверждении Положения о порядке осуществления общественными объединениями общественного контроля за исполнением законодательства Республики Беларусь об охране историко-культурного наследия: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 22.10.2008 № 1570.

**Асаблівасці захавання асобных катэгорый аб'ектаў культурнай спадчыны**

1. Аб зацвярджэнні Палажэння аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ, ажыццяўленні іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22.05.2002 № 651.

2. Об утверждении Положения о порядке и условиях присвоения статуса историко-мемориального места погребения: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 18.08.2015 № 699.

3. Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў: Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.12.2015 № 485.

4. Аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2015 г. № 485: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 5.03.2016 № 185.

5. Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн: Указ Президента Республики Беларусь от 24.03.2016 № 109.

**Ажыццяўленне работ на аб'ектах**

1. О системе мер, обеспечивающих проведение реставрационно-восстановительных работ на наиболее важных объектах историко-культурного наследия Республики Беларусь:

Репозиторий ВГУ

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 08.10.2002 № 1395.

2. Об утверждении Положения о порядке и размерах возмещения убытков, причиненных юридическому или физическому лицу приостановлением работ или иной деятельности в связи со случайным выявлением им недвижимого материального объекта, который может представлять историко-культурную ценность: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 19.07.2007 № 923.

**Вываз за мяжу, вяртанне, эвакуацыя**

1. О некоторых вопросах порядка перемещения отдельных видов товаров через Государственную границу Республики Беларусь: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 23.09.2008 № 1397.

2. Аб Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16.01.2009 № 43.

3. Об утверждении Положения о порядке временного отселения населения, эвакуации материальных и историко-культурных ценностей в безопасные районы: Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 25.04.2008 № 610.

**Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове ГКС**

1. Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях от 21.04.2003 № 194-З (Глава 19 “Административные правонарушения в области охраны историко-культурного наследия”, ст. 19.1 – 19.9).

2. Процессуально-исполнительный кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях от 20.12.2006 № 194-З (ст. 3.2. 3.4, п. 2, и 9 ст. 3.30).

3. О наделении должностных лиц Министерства культуры Республики Беларусь полномочиями на составление протоколов об административных правонарушениях и подготовку дел об административных правонарушениях к рассмотрению: Постановление Министерства культуры Республики Беларусь от 14.08.2007 № 36

4. Уголовный кодекс Республики Беларусь от 09.07.1999 № 275-З (ст. 136, 138, 228, 230, 344-347).

5. Уголовно-процессуальный кодекс Республики Беларусь от 09.07.1999 № 275-З.

Репозиторий ВГУ

## Літаратура

### *Крыніцы па курсу*


1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: [даведнік] / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Мінск: БЕЛТА, 2009.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск: БелСЭ, 1985.
